Партызанскія будні

У зонах, свабодных ад фашыстаў, працавалі электрастанцыі і цырульні

1 мая 1943 года ў чашніцкай брыгадзе «Дубава» на Віцебшчыне ў спецыяльна пабудаванай зямлянцы адкрылася партызанская карцінная галерэя. Палотны апавядалі пра барацьбу і побыт партызан, пра знішчаныя акупантамі вёскі. Падчас блакады ў 1944 годзе, калі варожае кола змыкалася, карціны давялося зняць з падрамнікаў. Іх скруцілі ў рулон, уклалі ў медную трубу і закапалі ў зямлю. Сёння гэтыя каштоўнасці захоўваюцца ў Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны і ў Музеі народнай славы ва Ушачах.

У партызанскіх атрадах былі не толькі мастакі, — музыкі давалі канцэрты, можна было глядзець дакументальныя і мастацкія фільмы, якія дастаўляліся з Вялікай зямлі. Агітбрыгады і ансамблі выступалі ў брыгадах і перад насельніцтвам. У зямлянках, шалашах і проста на лясных палянах працавалі школы.

Першыя партызанскія зоны на Беларусі з'явіліся ўвосень 1941-га. А да канца 1943 года пад кантролем партызан знаходзілася ўжо да 60 працэнтаў тэрыторыі рэспублікі. Існавала больш за 20 буйных партызанскіх зон. Гэта быў надзейны тыл, дзе размяшчаліся партызанскія аэрадромы, базы партызанскіх фарміраванняў.

На вызваленых землях аднаўляліся савецкія органы ўлады. Працавалі млыны, хлебапякарні, гарбарныя, кравецкія, шавецкія, збройныя майстэрні, шпіталі. Напрыклад, вясной 1943 года ў Расонах дзейнічалі электрастанцыя, сталоўка, цырульня і нават дом адпачынку для партызан, якія аднаўляліся пасля раненняў. У Полацка-Лепельскай зоне партызаны наладзілі работу двух скіпідарна-дзягцярных заводаў, 80 кавальна-слясарных, 54 гарбарных, 47 сталярна-бандарных майстэрняў, ганчарнага прадпрыемства. У зоне працавалі тры электрастанцыі, шэсць млыноў, на 20 невялікіх алейных заводах перапрацоўвалі насенне льну. Партызаны дапамагалі сялянам у палявых работах і ахоўвалі населеныя пункты ад магчымых нападзенняў карнікаў.



ПРИКАЗ
Начальника Центрального Штаба Партизанского Движения
№ 0042

Загад пра разгортванне рэйкавай вайны.

Мы сёння многа ведаем пра партызанскую барацьбу, пра ўнёсак народных мсціўцаў у Перамогу. Але сучаснаму чытачу, напэўна, цікава будзе даведацца не толькі пра змаганне, але і пра тое, як добра і маштабна было арганізавана такое супраціўленне: як людзі абжываліся ў лесе, здабывалі ежу, наладжвалі побыт. Пра ўсё гэта можна прачытаць у кнізе «Беларусь партызанская», над якой выдавецтва «Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі» працавала разам з Нацыянальным архівам Рэспублікі Беларусь, Беларускім дзяржаўным архівам кінафотафонадакументаў, Беларускім дзяржаўным музеем гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, Інстытутам гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук, абласнымі і раённымі гісторыка-краязнаўчымі музеямі.

Партрэты партызан, зробленыя мастаком Бжэзоўскім у 1943 годзе.

Гэта наш унікальны вопыт, пра які многім жыхарам розных куткоў былога Савецкага Саюза раней было невядома. І для таго каб кніга была даступная як мага большай колькасці чытачоў, тэкст у ёй пададзены на дзвюх мовах — рускай і англійскай.

Старшы навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі НАН Аляксандра КУЗНЯЦОВА-ЦІМАНАВА расказала, што вучоныя, якія стваралі артыкулы для гэтай энцыклапедыі, стараліся зрабіць кнігу зразумелай і цікавай для ўсіх. Перад аўтарамі стаяла няпростая задача: акумуляваць і адабраць найважнейшую інфармацыю і пры гэтым данесці людзям складаную акадэмічную гісторыю на больш простай мове.

Сёння выдавецтва «Беларуская Энцыклапедыя» шукае новыя формы падачы матэрыялу, якія маглі б зацікавіць сучасную моладзь. Кніга «Беларусь партызанская» шыкоўна афармлена. У ёй каля 600 ілюстрацый, тут можна ўбачыць багата архіўных крыніц. Таксама азнаёміцца з архіўнымі крыніцамі (дырэктывамі, данясеннямі, справаздачамі, малюнкамі, зробленымі партызанскім мастаком, картай, клятвай партызан, улёткамі, рукапіснымі часопісамі і дзённікамі, якія вяліся ў партызанскіх атрадах) можна было падчас прэзентацыі выдання на выстаўцы, арганізаванай Нацыянальным архівам Рэспублікі Беларусь.

Карта дыслакацыі партызанскіх атрадаў (1944 год).

КІНАХРОНІКА СВЕДЧЫЦЬ...

За гады вайны было знята больш за тры з паловай мільёны метраў плёнкі — на восемдзесят сутак бесперапыннага прагляду

Кінахроніка апавядае пра найважнейшыя баявыя аперацыі, вызваленні населеных пунктаў, знаёміць з героямі, сведчыць пра зверствы, што чыніліся фашыстамі. Кінааператары ваеннага перыяду разам з байцамі Чырвонай Арміі і партызанамі ўдзельнічалі ў баявых дзеяннях, таму акрамя камеры ў іх з сабой часта былі аўтамат, пісталет і дзве гранаты. Зброяй даводзілася карыстацца даволі часта, бо ў пагоні за каштоўнымі кадрамі яны імкнуліся трапіць у цэнтр падзей.

Усяго на лініі фронту і ў партызанскіх падраздзяленнях працавала 308 франтавых кінааператараў. Кожны чацвёрты з іх загінуў.

Даведацца больш пра кіналетапісцаў вайны, паглядзець знятыя імі кадры і пазнаёміцца з дакументамі тых часоў можна было падчас прэзентацыі мультымедыйнага праекта «Іх зброя — кінакамера». Яго падрыхтавалі Нацыянальны архіў РБ, Беларускі дзяржаўны архіў кінафотафонадакументаў, Музей гісторыі беларускага кіно і кінастудыя «Беларусьфільм».

Беларускія аператары з Мінскай студыі кінахронікі з першых дзён вайны ўвайшлі ў склад спецыяльных франтавых кінагруп. Іосіф Вейняровіч трапіў на Браншчыну, Уладзімір Цяслюк — пад Смаленск, Майсей Бераў — на Заходні фронт. Знятыя сюжэты адсылаліся ў Маскву на Цэнтральную студыю дакументальных фільмаў. Многія з аператараў атрымалі высокія ўзнагароды, пра што сведчаць дакументы, якія захоўвае Нацыянальны архіў.

Ваенны кіналетапіс вёўся з першых дзён вайны. Ужо праз месяц пасля яе пачатку за разгортваннем падзей на франтах сачыла каля сотні аператараў.

У Беларускім дзяржаўным музеі кінафотафонадакументаў захоўваецца самы ранні сюжэт, прысвечаны партызанскаму руху. Ён быў зняты ў Чэрыкаўскім раёне Магілёўскай вобласці ў 1941 годзе, калі толькі з'яўляліся першыя партызанскія атрады.

Іосіф Вейняровіч некалькі разоў перасякаў лінію фронту, у 1943—1944 гадах ён вёў здымкі на тэрыторыі акупаванай Беларусі — на поўначы ў раёне Бягомля, Лепеля, Полацка. Там ён зняў вялікую колькасць сюжэтаў, прысвечаных такім вядомым партызанскім камандзірам, як Мінай Шмыроў, Іван Ціткоў, Уладзімір Лабанок.

У фондах Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны захоўваюцца экспанаты, якія апавядаюць пра мужнасць і смеласць франтавых кінааператараў, прысвечана ім і асобная экспазіцыя. **Старшы навуковы супрацоўнік Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны Наталля ОБУХАВА** расказала, што з 1951 да 1990 года Іосіф Вейняровіч пастаянна наведваў музей, перадаў установе свае фатаграфіі, пасведчанне, з якім працаваў на фронце, і кінакамеру.

Дарэчы, на Віцебшчыну здымаць фільм пра партызанскую Беларусь акрамя Вейняровіча былі закінуты таксама Мікалай Пісараў, Ацілія Рэйзман і Марыя Сухава. Гэтая група здымала не толькі баявыя дзеянні, але і тое, як будаваўся партызанскі аэрадром ва Ушачах, як рамантаваліся ровары для разведкі.

Маладым дзяўчатам-аператарам даводзілася дзяліць з партызанамі ўсе нягоды ваеннага жыцця. Баявыя камандзіры вельмі цёпла адгукаліся пра работу «баявой» Марыі, згадвалі, як яна здымала фільм, як хадзіла ў партызанскія атрады, размаўляла з жыхарамі вёсак. Знятыя дзяўчынай кадры былі выкарыстаны пры падрыхтоўцы фільма «Народныя мсціўцы», стварэнні кінасюжэтаў пра рэйкавую вайну. Суровая зіма 1944-га была асабліва цяжкая, немцы сціскалі кола блакады. Было прынята рашэнне ісці на прарыў, разам з партызанамі спрабавалі выйсці з акружэння і аператары. Падчас Ушацкага прарыву загінулі Мікалай Пісараў і Марыя Сухава. Супрацоўнікі Нацыянальнага архіва знайшлі дакумент, датаваны маем 1943 года, які сведчаць аб смерці Марыі Сухавай. Апошнія яе словы былі пра тое, дзе схаваны знятыя матэрыялы...

Кінахроніка расказвае пра вызваленне Беларусі. У кінафільме «Мінск наш», дзе падае свастыка з фасада Дома ўрада, выкарыстоўваліся кадры, зробленыя аператарамі Беравым і Вейняровічам: адзін здымаў знізу, другі — з даху.

Кінастужкі паказваюць населеныя пункты такімі, якімі іх заспелі ў першыя гадзіны пасля вызвалення Чырвонай Арміяй. Многія кадры сведчаць пра злачынствы, якія чыніліся на акупаванай тэрыторыі, паказваюць спаленыя вёскі, вызваленне вязняў канцэнтрацыйнага лагера «Азарычы», трасцянецкага лагера смерці, лагера ваеннапалонных пад Віцебскам. Таму гэтая хроніка адыграла вялікую ролю ў Нюрнбергскім працэсе.

Матэрыялы падрыхтавала Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.